# АРГАНІЗАЦЫЯ ЭФЕКТЫЎНАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ З БАЦЬКАМІ ПА СТВАРЭННІ НЕАБХОДНАГА КАМУНІКАТЫЎНАГА АСЯРОДДЗЯ ВЫХАВАНЦАЎ ВА ЎМОВАХ БЛІЗКАРОДНАСНАГА ДВУХМОЎЯ Ў СЕЛЬСКАЙ УСТАНОВЕ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

***Мармыш Тацяна Станіславаўна,***
*намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*“Навучальна-педагагічны комплекс*
*Вензавецкі дзіцячы сад-сярэдняя школа”*

За акном восень. Дрэвы амаль голыя, а так хочацца яе затрымаць, цёплую, рознакаляровую.

Прапаную вам прыняць удзел у нашай традыцыйнай акцыі “Надоело говорить по-русски? Размаўляй па-беларуску!”, якая накіравана на барацьбу з “трасянкай”.

Прапаную вам восеньскі лісток упрыгожыць беларускім словам і апрануць наша дрэва ў залаты ўбор. *(Зачытваюцца напісаныя словы).*

Усё ж такі як прыгожа гучыць наша родная беларуская мова!!!

Невыпадкова сваё выступленне я пачала з гэтай акцыі. Наша ўстанова размешчана ў сельскай мясцовасці,  навучанне ажыццяўляецца на беларускай мове. Ва ўстанове  - 72 навучэнцы  1-11 класаў і 28 выхаванцаў дзвюх рознаўзроставых груп: ад 2 да 3  і ад 4 да 6 гадоў.

Нашы дзеці не заўсёды чуюць “правільную”, сапраўдную беларускую мову ў тым аб’ёме, які неабходны. Большая частка жыхароў нашай мясцовасці размаўляе на змешанай мове, што пацвярджаецца вынікамі анкетавання. Дзеці ў сям’і не чуюць правільнага вымаўлення ні рускай, ні беларускай мовы. І сям’я не заўсёды з’яўляецца носьбітам ці захавальнікам народных традыцый.

Таму галоўная задача, якую мы бачым, – далучаць выхаванцаў і іх бацькоў да багацця беларускай мовы, фарміраваць каштоўнаснае стаўленне да яе, развіваць актыўнае маўленне на роднай мове.

Акрамя агульнапрынятых форм работы, якія ставяць бацькоў у пазіцыю атрымальнікаў інфармацыі, сталі больш выкарыстоўваць формы, у якіх мамы і таты становяцца ў актыўную пазіцыю, становяцца не проста гледачамі, слухачамі, а стваральнікамі інфармацыі і рэалізатарамі сваіх ідэй.

Запрасілі бацькоў на літаратурную віктарыну “Па старонках беларускіх казак!”, дзе праз заданне “Навяжы казку на звязку” па колькасці “пацерак” даведаліся аб тым, ці чытаюць бацькі казкі сваім дзецям.

- А вы чытаеце сваім деткам беларускія казкі? А зараз і праверым.

Прапаную “беларускую казку навязаць на звязку” *(удзельнікі семінара выконваюць прапанаванае заданне: “Коцік, пеўнік і лісіца”, “Курачка-рабка”, “Лісіца і дрозд”, “Лісіца-хітрыца”, “Зайкіна хатка”, “Пілiпка-сынок”,*

*“Разумная дачка”, “Заяц і вожык”, “Залаты птах”, “Сабака і воўк”, “Залатая яблынька”).*

Вялікі дзякуй. Вы вельмі добра справіліся з прапанаваным заданнем.

Падчас тэатральнай пастаноўкі паводле беларускай народнай казкі “Каза-манюка” бацькі самі выконвалі дадзеныя ім ролі.

Законныя прадстаўнікі прынялі ўдзел у “Свяце роднай мовы”, якое прайшло ў інтэрактыўнай форме, дзе, пачуўшы мову дзяцей, якія спявалі, гулялі, расказвалі вершы і казкі, дарослыя самі сталі спрабаваць размаўляць па-беларуску. Бацькі не толькі ўспомнілі, як гучыць мова, але і самі станцавалі “Кракавяк” і пагушкалі з забаўлянкамі сваіх дзетак. Пасля ўдзелу бацькі, бабулі дзякавалі за такое цікавае мерапрыемства, усім спатрэбіліся прапанаваныя памяткі з народнымі забаўлянкамі, пацешкамі і лічылкамі.

Новай формай работы з бацькамі стала літаратурная гасцёўня “Які прыгожы свет паэзіі і прозы”, у межах якой мы выкарыстоўвалі інтэрактыўныя заданні.

Інтэрактыўнае заданне “Я і літаратура”, прыём “жывая кніга” дапамаглі зняць напружанасць, стварыць спрыяльныя ўмовы для шчырай размовы з бацькі, якія па чарзе перадавалі адзін аднаму сваю прачытаную кнігу, як сімвал сустрэчы ў літаратурнай гасцёўні, успаміналі эпізоды з жыцця герояў твораў, агучвалі праблемы і звязвалі іх са сваім жыццём.

Матулі і таты рыхтавалі інфармацыю на роднай мове пра сваю малую радзіму, пра знакамітых людзей мясцовасці. Цікавым атрымаўся - экспромт-канцэрт любіцеляў паэзіі.

Паважаныя калегі, прапаную вам таксама стаць удзельнікамі экспромт-канцэрта – прачытаць і праінсцэніраваць любімыя паэтычныя творы. Хто будзе мець цяжкасці, можа карыстацца “памяткай”. *(Выкананне прапанаванага задання)*

Дзякуй за ўдзел!

- Што Вы адчувалі, калі чыталі вершы на беларускай мове?
- Ці ўзнікалі ў вас цяжкасці?

Паважаныя калегі, заняткі літаратурнай гасцёўні дапамагаюць нам пераканаць бацькоў у неабходнасці і важнасці беларускага слова, аб чым сведчаць дыялогі паміж выхавальнікамі і бацькамі, бацькамі і дзецьмі, маналогі дзяцей у час гульні.

Цікавай сумеснай формай работы стала квэст-гульня “Край мой дзівосны”, згодна з якой выконваліся заданні на станцыях “Прыродныя дзівосы”, “Чароўны куфэрак”, “Алфавіт для разумных і кемлівых”. Законныя прадстаўнікі сталі актыўнымі ўдзельнікамі гульні, разам з дзецьмі папаўнялі лексічны запас беларускамоўнымі словамі.

У межах сумеснай даследчай работы “Аб чым раскажа вёска Вензавец?”выхаванка рознаўзроставай групы разам з матуляй вызначалі

паходжанне назвы вёскі Вензавец, падзеі, якія з ёй звязаны, адметныя мясціны малой радзімы.

З мэтай умацавання інстытута сям'і, падтрымкі і развіцця сямейных традыцый, умацавання дзіцяча-дарослых адносін, папулярызацыі беларускай мовы на дзень сям'і праведзены фестываль-ярмарка сямейных традыцый і каштоўнасцей, на якім бацькі і дзеці прадстаўлялі і прэзентавалі свае сямейныя традыцыі на беларускай мове.

Эфектыўнай формай работы стала ўключэнне бацькоў і выхаванцаў у праектную дзейнасць.

Так, рэалізацыя праекта "Віртуальная сацыяльная гасцёўня "А сонца свеціць усім аднолькава" пачалася з выхаванцаў рознаўзроставых груп, якія прынялі ўдзел у піяр-кампаніі "Я – беларус!", правялі міні-даследванне "Мая сям'я – мае карані", выхаванцы пазнаёміліся з беларускім нацыянальным касцюмам, нацыянальнай кухняй беларусаў, а таксама пашырылі веды пра быт і культуру не толькі беларускага народа, але і іншых народаў (рускіх, украінцаў, татараў, казахаў).

Найбольш цікавым для нашых выхаванцаў стаў сямейны праект шостага школьнага дня "Гулялі бабулі, гулялі матулі, гуляем і мы", у межах якога матулі і бабуліі, дзеці якіх наведваюць групу выхаднога дня ў суботу, праводзілі розныя беларускія народныя гульні, у якія часцей за ўсё гуляюць у сваёй сям'і.

Зараз прапаную і вам прыняць удзел у гульні "Шышкі. Жалуды. Арэхі". *(Гуляем у гульню).*

А можа хто з вас і сам хоча правесці беларускую народную гульню?

У практычнай дзейнасці нашай установы ёсць шмат іншых форм работы з бацькамі. Я спынілася на найбольш эфектыўных і цікавых для нашых бацькоў і выхаванцаў.

Гучыць мова беларуская на Дзятлаўшчыне, гучыць яна і сёння на семінары. А ці будзе яна гучаць у вашых установах, залежыць ад вас. Усё ў вашых руках.

Падводзячы вынік, кожнаму з вас прапаную выбраць сабе далонь і на кожным пальчыку запісаць форму работы, прыём, які вы будзеце выкарыстоўваць у сваёй дзейнасці ці прапануеце сваім педагогам.

Спадзяюся, што наш вопыт не пакіне вас абыякавымі, выкліча водгукі, меркаванні, прапановы. Будзем разам працаваць на гэтай удзячнай ніве, будзем выхоўваць у нашых дзяцей пачуццё любві і пашаны да роднай зямлі, роднай мовы разам.